# Прамова тав. Чарвякова.

— VIII Зьезд Саветаў,—кажа тав. Чарвякоў,—упісвае новую яскравую старонку ў гісторыю адбудовы краіны рабочых і сялян Савецкай Беларусі. У першую чаргу ён надвядзе вынікі тэй працы, якая праведзена ўрадам у час паміж VII і VIII зьездамі саветаў.

Гэты Зьезд набывае яшчэ большае значэньне, калі ўзяць над увагу, што Савецкая Беларусь зараз аб'ядноўвае большасьць зямель Савецкага Саюзу, населеных беларусамі.

Далей тав. Чарвякоў спыніўся на нашым міжнародным становішчы. Зараз, як ніколі капіталістычны съвет вострыць зубы на Савецкі Саюз.

Кастрычнікавая рэволюцыя будзіла ўсіх прыгнечаных і гаротных. Рабочыя і сяляне ўсяго съвету і калёніяльныя народы пачынаюць больш рашуча выступаць супроць капіталістаў і імпэрыялістаў. Буржуазея ўжывае ўсе сродкі, каб задушыць рэволюцыйны рух. Вось чаму мы зараз бачым, з якой азьвярэласьцю нападаюць імпэрыялісты на рэволюцыйны Кітай.

Нераходзячы да нашых адносін з буржуазных краін, прамоўца кажа, што Савецкі Саюз імкнецца да міру і ўнікае ўсялякіх сутычак. Парадак дня гэтага зьезду, дзе ўсе пытаньні датыкаюцца выключна мірнага будаўніцтва, зьяўляецца лепшым доказам нашых мірных імкненьняў.

Галоўнымі пытаньнямі нашага зьезду, кажа тав. Чарвякоў, зьяўляецца будаўніцтва прамысловасьці, сельскае гаспадаркі і культуры. Мы павінны зьвярнуць увагу на разьвіцьцё нашае прамысловасьці і індустрыялізаваць нашу краіну. У галіне сельскай гаспадаркі перад намі стаіць задача ўвесьці больш інтэнсыўныя формы апрацоўкі зямлі і павысіць таварнасьць гаспадаркі нашага сялянства.

Савецкая ўлада шмат зрабіла для пашырэньня асьветы сярод працоўных; аб гэтым съведчыць актыўны ўдзел рабочых і сялян у савецкім будаўніцтве.